7. Ненадавец, А. М. Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец ; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 239 с.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Вышэйш. шк., 2006. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне. – 608 с.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе. – 790 с.

*Алег Хаменка*

## ЭТНАГІСТАРЫЧНЫ КАНТЭКСТ ВЫКАРЫСТАННЯ СЛОВАЎ «БЕЛЫ», «БЕЛА», «ALBA» У ФАЛЬКЛОРЫ, ЭТНОНІМАХ І ТАПОНІМАХ СЛАВЯН

*Aleg Khamenka*

## ETHNO-HISTORICAL CONTEXT OF THE USE OF THE WORDS «WHITE», «BELA», «ALBA» IN SLAVS' FOLKLORE, ETHNONYM AND PLACE NAMES

*У артыкуле прааналізаваны варыянты падабенства і адрозненняў семантыкі згадвання белага колеру і блізкіх да яго фанем у фальклоры, тапонімах і этнонімах славян: беларусаў, рускіх, сербаў, харватаў, славакаў.*

*The article analyzes the options for the similarities and differences of mentioning semantics of white and close to it phonemes in Slavic folklore, place names and ethnonyms: Russian, Serbs, Croats, Slovaks.*

Па меркаваннях даследчыкаў, сёння ў свеце жыве звыш 200 мільёнаў чалавек, якія размаўляюць на 13 славянскіх мовах, аб'яднаных ва ўсходнюю, паўднёвую і заходнюю групы [2, с. 15]. Паколькі з часу праславянскай еднасці мінула шмат стагоддзяў, многія фрагменты культуры славян сучасных вымагаюць сапраўднай дэшыфроўкі і суаднясення з шырокім этнагістарычным кантэкстам і фальклорнымі помнікамі суседзяў, а часам суседзяў даволі далёкіх. Менавіта такія думкі пакідае вопыт даследавання перактыжаванняў і адрозненняў семантыкі ўзгадвання белага колеру ў фальклоры, тапонімах і этнонімах беларусаў, рускіх, украінцаў, себаў, харватаў, славакаў.

«Ой, у мяжы, у мяжы бел камень ляжыць / Іграйце, малойцы, гуляйце! / Пад тым камянём – лютая змяя…», – давялося неяк пачуць ад спявачак з вёскі Закальное песню, запісанную напрыканцы XX стагоддзя ў Цэнтральнай Беларусі [1, с. 380]. Па меры прапявання сюжэту гэтай валачобнай песні менавіта вакол *памежнага белага каменя* разгортваліся падзеі тыпалагічна суадносныя з т.зв. «асноўным міфам славянскай міфалогіі» з удзелам Змея, Іванькі і яго нарачонай панны, якую ён абараняе і вядзе да шлюбу. Тэкст – тыповы прыклад старажытнага семіятычнага маркіравання міфапаэтычнага цэнтра Сусвету каменем [4, с. 74]; прычым, цікава, што каменем *белым*: культвым артэфактам, які паходзіць з *архаічных* «дахрысціянскіх» часоў, як і сам старажытны культ шанавання камянёў.

Семіятычны маркер *белага* колеру і фанем «*белы»*, «*бяліць»* як архаічных рытуальных сімвалаў, знітаваных з касмічнай пабудовай міфапаэтычнага Сусвету, Сонцам як аб'ектам старых вераванняў, дагэтуль адсочваецца ў беларускай традыцыі і падмацоўваецца экспедыцыйнымі запісамі сучасных фалькларыстаў. Менавіта промнямі Сонца, калі яно ўвесну ўзмацняе сваю інтэнсіўнасць, беларусы бялілі саматканы лён – з неалітычных часоў асноўную тканіну традыцыйных строяў і абрадавага тэкстылю еўрапейцаў. «Бялілі на сонцы…» – і, так сама: «…тады… сады заквітнеюць, то тó, каторае далжно быць белае, бялілі…», – ахвотна распавядаюць даследчыкам носьбіты традыцый Беларускага Панямоння пра адбельванне ільну найбольш распаўсюджанай і старажытнай тэхналогіяй – сушкай на сонцы [8, с. 558 – 559].

Цікавы матэрыял даюць славянскія тапонімы і этнонімы, дзе прыгадваюцца розныя значэнні *белага* колеру і фанем «*бел*», «*бял*». Назвы Белая Харватыя і Белая Сербія часцей за ўсё прыгадваюць ў сувязі з аналізам аднаго з найбольш знакавых для этнагісторыі трактатаў Сярэднявечча «Аб кіраванні імперыяй», альбо «De administrando imperio» [9], аўтарам якога з'яўляецца Візантыйскі імператар Канстанцін VII Брвовародны, што нарадзіўся ў 913 годзе і быў сынам імператара Льва VI Мудрага. Трактат «Аб кіраванні імперыяй» Канстанцін VII прысвяціў свайму сыну Раману II. Гэты твор датуецца сярэдзінай X стагоддзя (перыядам паміж 948 і 952 гадамі). Існуе тры рукапісныя тэксты трактата. Два з іх захоўваюцца ў Францыі і адзін – ў Бібліятэцы Ватыкана. Лічаць, што гэта праца стваралася Канстанцінам не для публічнага карыстання, а як тлумачальны даведнік для нашчадкаў, і менавіта таму атрымала шырокую вядомасць толькі ў 1611 годзе, калі яе надрукаваў і апублікаваў Ёханес Меўрзій – гістарыёграф тагачасных Генеральных Штатаў Нідэрландаў.

У любым выпадку гэта найкаштоўнейшая крыніца інфармацыі пра гісторыю армянаў, грузінаў, печанегаў, хазараў, Русі ды іншых народаў, якія, на думку Імператара Канстанціна, мусяць падпарадкоўвацца богаабранаму народу Рамеяў – Візантыйскай Імперыі. У гэтым трактаце Канстанцін VII піша наступнае: «Ды будзе вядома, што сербы паходзяць ад неахрышчаных сербаў, якіх завуць таксама белыя, і жывуць яны па тым баку ад Цюркіі (тагачасная візантыйская назва земляў венграў) ў мясцовасці, што завецца Бойко. З імі мяжуе Франкія (тагачасная назва земляў германскіх плямёнаў) а таксама Вялікая Харватыя, дзе нехрышчоная частка таксама завецца Белай» [9]. Вызначэнне тэрыторыі з назвай Бойка (Bojko) да гэтага часу застаецца адкрытай для версій і даследаванняў гісторыкаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шэраг даследчыкаў, якія аналізавалі розныя кніжныя крыніцы Сярэднявечча і ў тым ліку трактат «Аб кіраванні імперыяй» прыйшлі да высновы што Белая Харватыя знаходзілася ў вярхоўях Віслы побач з Кракавам. Прынамсі Харвацкія даследчыкі менавіта так і лічаць, і нават вылучаюць прыкладныя межы X стагоддзя, якія ўмоўна існавалі паміж ахрышчанай Харватыяй і неахрышчанай Белай Харватыяй. Пры гэтым Белую Харватыю адзначаюць як першародную бацькаўшчыну для ўсіх харватаў. Трэба адзначыць, што Белай Харватыяй серба-харваты называюць адну з першых славянскіх дзяржаў, якая існавала ў VII стагоддзі на частцы тэрыторыі сучасных Польшчы, Чэхіі і Славакіі. Аднак ў цяперашніх нямецкіх і расейскіх крыніцах гэту дзяржаву называюць міфічнай, а першымі славянскімі дзяржавамі лічаць Вялікую Маравію і дзяржаву Само, прычым і па часе існавання, і па тэрыторыях гэтыя дзяржавы прыкладна супадаюць. Што тычыцца Бела-Сербіі, то яе межы высветлены даволі прыкладна – гэта тэрыторыі цяперашняй Германіі на захад ад Белай Харватыі – на паўночны-захад ад Эльбы, дзе знаходзяцца сучасныя гарады Дрэздэн, Лейпцыг і пражывае народ сорбы, альбо лужыцкія сербы.

Напрыканцы Вялікага Перасялення народаў – прыкладна на мяжы VI – VII стагоддзяў народы гэтых земляў перасунуліся на Балканы – у землі цяперашняй Харватыі, Босніі і Сербіі. Трэба згадаць, што сталіцай Вялікай Маравіі і Белай Хаватыіі нярэдка называюць горад Велеград (па іншых версіях – горад Нітру [5]), дзе займаліся місіянерствам знакамітыя асветнікі Кірыл і Мяфодзій [3], а сталіцай новай Сербіі стаў горад Белград, які атрымў гэту назву ў IX стагоддзі. Сувязі паміж назвамі сталіц, магчыма, няма, але паходжанне назвы Белгард відавочна звязана са словамі «белы».

Важна адзначыць, што Белая Харватыя згадваецца ў Летапісе святара-летапісца Дукляніна, які яшчэ называюць «Барскім радасловам». Адны даследчыкі датуюць яго XII стагоддзем, іншыя – XIV-м. У любым выпадку ён апісвае падзеі з IX па XII стагоддзе. У «Аповесці мінулых гадоў» [7] таксама згадваецца Белая Харватыя. Яшчэ белых харватаў згадвае ў сваіх дакументах кароль Альфрэд Вялікі, летапісец Нестар ў «Нестараўскім летапісе» [6] ды іншыя аўтары ў пазнейшых крыніцах, якія часам выкарыстоўваюць гэтую назву і для пазначэння Прыморскай Харватыі. Адна са згадак аб белых харватах з «Нестараўскага летапісу» распавядае наступнае: «Праз шмат часу пасля вавілонскага гармідару селі славяне па Дунаі, дзе зараз зямля Вугорская і Балгарская. Ад тых славян разышліся па зямлі плямёны і празвалі сваімі імёнамі… і далей…. а вось таксама славяне – харваты белыя, сербы і хорутане. Калі волхі (напэўна валахі) айшлі на славян дунайскіх, пасяліліся сярод іх і пачалі насільнічать… харваты белыя, сербы і хорутане рушылі і селі па Дняпры» [6].

Паводле «Аповесці мінулых гадоў» [7], у 907 годзе харваты (магчына белыя харваты) прынялі ўдзел у паходзе князя Алега на Царград. Адносна упэўнена можна сцвярджаць, што харваты падпарадкоўваліся Кіеўскай Русі (у той час Русі) пасля паходу князя Уладзіміра ў 992 годзе. Падчас гэтага паходу Уладзімір заснаваў горад Уладзімір-Валынскі, што пацверджана археалагічнымі матэрыяламі. І, мяркуючы па венгерскай хроніцы «Gesta Hungarorum», ў XII стагоддзі белыя харваты жылі і на паўднёвых схілах Карпат, і ў Закарпацці. Магчыма, з гэтых крыніц паўстала сцверджанне, што белыя харваты з'яўляюцца непасрэднымі продкамі карпацкіх русінаў.

Увогуле можна сцвярджаць, што белыя харваты і белыя сербы, Бела Сербія ў іншых крыніцах – Альтэра Кробваті, Алба Кроаты, Алба Србія атрымалі такую назву з некалькіх прычынаў: па-паршае, «белыя» – значыць «першапачатковыя», «неахрышчаныя» (паводле трактата «Аб кіраванні Імперыяй» Канстанціна VII [9]. Па-другое, згодна даследаванняў летапісаў харвацкімі даследчыкамі гэта значыць – «чыстыя», «некранутыя». Згодна з сербскімі і балгарскімі крыніцамі, у першаславян напрамкі свету мелі каляровыя азначэнні: белы – захад, сіні (блакітны) – ўсход, чорны – поўнач, чырвоны – поўдзень, такім чынам, белыя сербы і белыя харваты, можа вызначаць як «неахрышчаныя заходнія».

Назва «Белая Русь» упершыню зафіксавана ў лацінскай форме «Alba Russia» каля 1255г. у ананімным геаграфічным трактаце. Пачатак апісання земляў, што знойдзены ў Ірландыі. Я аналізаваў ксеракопію часткі гэтага трактата, але сам я не здолеў грунтоўна разабраць яго стара-лацінскі тэкст. Аднак, даследчкі трактата выказваюць меркаванне, што назва, верагодна, тычылася тэрыторыі Наўгародскай рэспублікі, бо ўзгадана ў такім кантэксце: «Адзін з іх, слухаючы брата Вайслана, майго таварыша, які прапаведваў in Alba Ruscia, заклікаў таго ісці з ім да згаданых карэлаў». Польскі даследчык, доктар Конрад Горскі тлумачыць гэту згадку крыху па-іншаму – геаграфічны кантэкст гэтага запісу, калі пералічваецца Прусія, Яцвягі, Жамойць, Літва, Латгалія, Лівонія, Эстонія, дае падставы рабіць выснову, што пад «Альба Русія» аўтар мае на ўвазе Заходнюю Русь у межах ад Пскова да Турава. Наступныя па храналогіі звесткі прыкладна 1360-х гадоў пра Белую Русь «Alba Russia» знаходзяцца ў рыфмаваных запісах Генрыха фон Мюгельна пра крыжацкія ўварванні на землі Пскоўскага княства. У 1381г. назва «Alba Russia» ужыта да Полацка як «крэпасці Белай Русі» у «Хронікі Польшчы Яна з Чарнкова».

У сярэдзіне XV ст. большасць згадак пра Белую Русь «Alba Russia» паходзіць з заходнееўрапейскіх крыніц і адносіцца да тэрыторыі Вялікага Ноўгарада. Самы даўні пісьмовы помнік усходнеславянскага паходжання, які згадвае «Белую Русь», створаны, верагодна, сербам Пахоміем Лагафетам у Вялікім Ноўгарадзе каля 1461 г., але ён быў напісаны на лацінскай мове.

Такім чынам, белы колер і фанемы *«белы»*, *«бяліць»* у фальклоры і ў традыцыйнай культуры славян дагэтуль утрымліваюць семіятычную сувязь не заўсёды з уласнай храматыкай, а хутчэй з архаічнымі культавымі сімваламі (цэнтрам міфапаэтычнага Сусвету, Сонцам і энергіей яго промняў, Захадам); а тапонімы Беласток, Бельск, Biała Podlaska, Белая Цэрква, Белград, Белгород, Белаозеро і шэраг іншых могуць быць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязаны не з колеравай храматыкай, а са старажытным (напрыклад, сярэднявечным грэчаскім) кантэкстам ужывання такіх фанем і сімвалаў – у значэнні «*першапачатковы*», «*неахрышчаны*», «*заходні*».

**Спіс літаратуры:**

1. Валачобныя песні. Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, склад. Муз. Часткі В. І. Ялатаў. Рэд. Тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
2. Гимбутас, М. Славяне / М. Гимбутас / Пер с англ Ф.С.Капицы. – М.: ЗАО Центрполиграф, 2003. – 216 с.
3. Знакомство со Словакией. Нитра – бывшая столица Великой Моравии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.otzyv.ru/read.php?id=161256. – Дата доступа : 17.04.2016.
4. Калацэй, В. Параўнальная міфалогія / В.Калацэй. – Мінск : ПУП «Паркус Плюс», 2009. – 122 с. : іл.
5. Нитра [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.km.ru/turizm/encyclopedia/nitra. – Дата доступа : 27.04.2016.
6. Несторовская (Хлебниковская) летопись [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://sites.google.com/site/hazarskijinformograf/home/hazarskaa-biblioteka/bibliograficeskie-sborniki/letopisi/nestorovskaa-hlebnikovskaa-letopis. – Дата доступа : 23.04.2016.
7. Повесть Временных лет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://lib.ru/HISTORY/RUSSIA/povest.txt . – Дата доступа : 17.04.2016.
8. Смірнова, І.Ю. Традыцыйнае адзенне / І.Ю. Смірнова // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; Складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2006. – Кн. 2. – С. 547 – 632.
9. De Administrando Imperio (Dumbarton Oaks Texts) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.amazon.com/Administrando-Imperio-Dumbarton-Oaks-Texts/dp/0884023435. – Дата доступа : 27.04.2016.

***Руцкий Евгений***

## СТРУКТУРА ЭСХАТОЛОГИЧЕСКОГО МИФА

*Статья предлагает новую структуру эсхатологического мифа. Ее образуют следующие вопросы: Конец кого или чего? Когда он происходит? Как узнать начало конца, если он будет? Как наступает конец? Почему наступает конец? Что следует за концом существования?*

***Rutskii Eugene***

## THE STRUCTURE OF ESCHATOLOGICAL MYTH

*The article proposes a new structure of the eschatological myth. This structure consists of the following questions: The end of whom or what? When it happens? How can people recognize the beginning of the end if it really starts? How is the end starts? Why is the end? What follows the end of existence?*

Эсхатологический миф репрезентирует пеструю совокупность традиционных представлений о конце существования. Поскольку это беспокоящая тема как индивидуального, так и коллективного порядка, едва ли возможно найти хотя бы одну традицию в мире, которая ее не касается. Из-за того, что эсхатологические представления развивалась в том числе в полностью изолированных друг от друга культурных контекстах, встает вопрос о том, что же эти разрозненные представления объединяет.

Компаративистское изучение множества эсхатологических представлений – от первоисточников авраамических и дхармических традиций до мифологий аборигенных общностей – позволило выявить в них общую логическую артикуляцию, детерминированную психотравматическими переживаниями факта или идеи конца.

Структурно логика эсхатологического мифа базируется на совокупности предлагаемых каждой традицией ответов на простой комплекс вопросов: конец кого или чего, как он происходит, когда он происходит и как это узнать, почему он происходит, можно ли его предотвратить (при негативной оценке конца) или приблизить (при позитивной оценке), что происходит после него, как именно, для кого и т.д. Структурирование эсхатологических представлений по принципу дополнительности и в соответствии с подобными вопросами способно обнажить морфологию эсхатологического мифа с учетом различных вариаций. Эти вариации иногда совпадают, а иногда расходятся. Тем не менее, общая картина ответов на обозначенные вопросы способна продемонстрировать возможности культурного реагирования конечности, которые кодируются в мифе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ